# АБНАЎЛЕННЕ ЗЯМЛІ Ў РЭГІЯНАЛЬНАЙ МЕДЫЯСІСТЭМЕ

***А. Г. Слука***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*sluka12071941@yandex.ru*

Публіцыстыка прафесара Б. В. Стральцова – каштоўная з'ява ў беларускай журналістыцы. Яго творчасць праблемная, народная, палітычная, дзяржаўная, грамадская. Адзін з яго вобразаў – хлебароб, і «касец і жнец». Дадзены артыкул – працяг яго ідэй у сучаснасці.

***Ключавыя словы:*** публіцыстыка; інфармацыя; журналістыка; дзяржава; палітыка; Радзіма; беларуская вёска; грамадзянін.

# LAND UPDATE IN THE REGIONAL MEDIA SYSTEM

***O. G. Sluka***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: O. G. Sluka (sluka12071941@yandex.ru)*

Journalism of professor B. V. Straltsov is a valuable phenomenon in Belarusian journalism. His creativity is problematic, folk, political, state, social. One of his images is a breadwinner, and «the scythe and the reaper». This article is a continuation of his ideas in the present.

***Key words:*** publicism; information; journalism; state; politics; Motherland; Belarusian village; citizen.

У глабальнай інфасферы рэгіянальная падсістэма займае першае месца па аўтарытэтнасці звароту да аўдыторыі. Паўсядзённае жыццё людзей пярэдняга краю грамадства, адлюстраванае ў раённай прэсе, прыцягвае першароднасцю і ўнікальнасцю. Вяскоўцы найперш жывуць тым, што адбываецца не за трыма морамі, а ў суседзяў, на сваім прадпрыемстве, што новага ў вёсцы, як жыве родная школа, жывёлагадоўчая ферма і ў якой маладой сям'і нарадзілася дзіця. Гэтыя з'явы як жыццёвы пульс існавання чалавека, пастаянная плынь яго зменлівасці. Там, на малой радзіме, усё гэта прапісана і паказана ў пяршасных каналах камунікацыі, і найперш у раённай газеце.

Цікавае і каштоўнае гэта ўтварэнне – раённая інфасістэма. Людзі бачаць як на экране сваё жыццё. Але гэта бачанне вельмі прынцыповае і крытычнае. Погляд раённай газеты на сваю частку зямнога шара заўжды ўважлівы, пільны і крытычны. Разважлівая думка гаспадара для захавання і развіцця традыцыйнага ўкладу жыцця, асваення сучасных каштоўнасцей працы і культуры, якія дапамагаюць чалавеку будаваць уласны лёс, прымяняючы дасягненні чацвертай інфарэвалюцыі.

Раённая медыясітэма акрэслівае своеасаблівую аўру існавання канкрэтнага раэгіёна, мясцовасці, спецыфічнага цыклу жыцця людзей на Палессі, у Белавежы, на Бярэзіншчыне і г. д. Журналісты як бы высякаюць на помніку часу ўклад насельніцтва ў гістарычны працэс, асабліва выдзяляючы самую высокую каштоўнасць іх працы – несці хлеб да стала ўсяго народа. Журналісты, нібыта арганізатары пачэснага рытуалу, пастаянна ўхваляюць працу хлебароба, і, падкрэслім, стваральную працу – гэта вечная тэма.

Там, у вёсках, аграгарадках і раённых гарадах пульсуе пачатковае звяно жыцця народа і краіны. На старонках большасці раённых газет галоўным героем з'яўляецца працоўны чалавек, яго кваліфікацыя, моцныя і адмоўныя рысы характару. Адтуль, з малой радзімы, вырастае народ і нацыя, ідуць у жыццё знакамітыя прадстаўнікі народа, ствараецца нацыянальная гісторыя. Медыясістэма малюе вечныя карціны: пастаяннае адлюстраванне сёняшняга дня і шырокая панарама таго, як раён замацоўваўся ў гісторыі праз біяграфіі сваіх выхаванцаў-землякоў, якія сталі гонарам краіны праз працу, талент і любоў да Радзімы.

У рэчышчы кругавароту жыцця, што адбіваецца ў прэсе, праяўляюцца ўсе самыя важныя дзяржаўныя праблемы. Улада вырашае, а народ здзяйсняе гэтыя пастановы. Такая логіка сучаснага жыцця. Калі гэтыя рашэнні супадаюць з інтарэсамі людзей і становяцца свядомасцю чалавека, то ўсё грамадства жыве і дзейнічае ў спакойнай стваральнай абстаноўцы.

Рэгіянальны друк з'яўляецца адказным і дзейсным сродкам грамадскага кантролю. Кожны артыкул заўсёды мае рэзананс, таму што адрасат побач і за яго дзеянні не патрэбна «шукаць праўды» ў Мінску. «Герой» свой, і ўшчуванне пры ўсім народзе, які добра ведае чыноўніка, мае вельмі эфектыўнае выхаваўчае ўздзеянне. Нездарма крытычныя матэрыялы ў раённых газетах з'яўляюцца не часта, але калі да чытача яны прыходзяць, то вырашаюцца важныя грамадскія і сацыяльна-бытавыя пытанні. Слова пра блізка ў афіцыйным газетным абмеркаванні – моцны маральна-этычны фактар ўздзеяння на чалавека.

У раённай газеце захоўваецца вобраз нашай Радзімы. Кожны нумар уносіць у яе карціну ўсё новыя і новыя колеры. 118 нумароў раённых га-

зет – гэта столькі матэрыялаў пра нашых выдатных грамадзян. І гэта з нумара ў нумар, рыса да рысы. Так ствараецца характар, вобраз народа. Народа-стваральніка, які праз сучаснасць імкнецца будаваць наша будучае.

Гэта змястоўны вобраз беларускага грамадзяніна. Ён пастаянна знаходзіцца ў пошуку свайго месца, устойлівай пазіцыі ў супярэчлівым грамадстве. На аснове гэтага журналісты рэгіёнаў імкнуцца вырашаць глабальныя праблемы існавання вёскі як жыццёвай прасторы беларусаў. Нашу вёску пакідаюць яе гаспадары. У складзе насельніцтва Беларусі вяскоўцаў толькі 18 %. Вылічыць адтуль дзяцей і пенсіянераў, то працаздольных застанецца не больш за 10 %.

У апошні час адбываецца трайная міграцыя беларускага насельніцтва: з вёскі ў раённыя і абласныя гарады, адтуль у Мінск, а потым у замежныя краіны. У 2018 г. у Еўропу выехала больш за 40 тыс. чалавек. Фактычна адзін сельскі рэгіён рэспублікі з’ехаў за мяжу ў поўным складзе. У асноўным моладзь і працаздольная частка грамадзян. Краіна церпіць ад гэтай непажаданай з’явы вялікія страты.

Рэгіянальная прэса шукае таксама ідэю захавання старой і будаўніцтва новай вёскі. Што гэта будзе? Якая будучыня аграгарадкоў? Гэта праблема хвалюе грамадскасць. Актуальнай для прэсы з’яўляецца таксама праграма ўладкавання малых гарадоў. Адкрыццё там сучасных прадпрыемстваў, культурна-адукацыйных устаноў, забеспячэнне насельніцтва таварамі, прадуктамі, працоўнымі месцамі. Набходна распрацаваць перспектыўную праграму развіцця беларускіх гарадоў як адну з найважнейшых дзяржаўных задач.

Успомнім, што гэтыя праблемы сугучны творчасці Б. В. Стральцова. У свой час ён напісаў сцэнарый да фільма пра знакаміты ў СССР калгас «Рассвет». Стваральны талент беларускага грамадзяніна праявіўся ў сяле Мышкавічы, дзе быў пабудаваны цудоўны горад-сад ужо сённяшняга дня. У калгасе «Рассвет» была здзейснена мара людзей жыць як у горадзе. Сучасная беларуская вёска імкнецца ажыццявіць гэту мару.

Беларускія СМІ пярэдняга краю дзейнічаюць сугучна часу. Несумненна, што будуць адбывацца палітычныя змены, арганізацыйная перабудова рэгіянальнай медыясістэмы, іх сацыяльны статус, але нязменным застанецца традыцыя «пісаць гісторыю сучаснасці».